

# КРАМКО
## Аляксандр Яўгенавіч
## (н. 25.1.1961)

Дырыжор, саліст, кампазітар, аранжыроўшчык. Заслужаны артыст Беларусі (1998).

Нарадзіўся ў вёсцы Сімакава Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Дзяцінства прайшло ў горадзе Стоўбцы. З маленства Аляксандра Яўгенавіча атуляла музыка. Дзядулі музыканта былі майстрамі па вырабе скрыпак, ды і самі няблага ігралі на іх. Бацька музіцыраваў на гітары і гармоніку. Калі маленькаму Аляксандру споўнілася 4 гады, дзядуля і бабуля падарылі яму маленькі акардэон. Ужо праз тыдзень здольны хлопчык мог лёгка сыграць па слыху ўсё, што чуў. У 1969—74 гадах ён вучыўся ў музычнай школе па класе акардэона. Адначасова іграў на вяселлях, святах, вечарынах, быў удзельнікам вакальна-інструментальных ансамбляў, у якіх іграў на клавішных, гітары, саксафоне. Тады ж хлапец навучыўся іграць на дудцы.

У 1980 годзе Яўген Аляксандравіч скончыў культурна-асветніцкае вучылішча па класе акардэона, у 1984 — Мінскі інстытут культуры па класе домры. Падчас вучобы ў інстытуце зацікавіўся беларускай фальклорнай спадчынай, быў удзельнікам гуртоў «Валачобнікі», «Вязынка» і інш. Ні на хвіліну не расставаўся А. Крамко з музычнымі інструментамі. Нават на службу ў арміі быў размеркаваны ў палкавы аркестр. Іграў на валторне, тубе, стварыў біг-бэнд, у якім іграў на саксафоне.

У 1986 годзе Аляксандру Яўгенавічу лёсам было наканавана прыйсці ў Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча, у якім і сёння іграе на розных відах дудак: поршневай, парнай, з перадувам, а таксама свістульцы, акарыне, жалейцы, дудзе, саломцы, чаротцы, варгане і, безумоўна, на гармоніку, ліры, клавішных.

А.Я. Крамко — аўтар шматлікіх музычных твораў, сярод якіх канцэрціна і элегія «Заўсёды са мною» для дудкі з аркестрам, элегія «Настачка» для дудкі і фартэпіяна, перагукі-перазвоны для дудкі і цымбал з аркестрам, канцэртныя творы «Абцасы з выкрутасамі», «Росныя хвалі» для дудкі, жалейкі, акарыны і дуды з аркестрам, «Ох, без дудкі, без дуды ходзяць ногі не туды» для дудкі, саломкі, акарыны і жалейкі з аркестрам і інш. З 1989 года Аляксандр Яўгенавіч выкладае ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, з'яўляецца аўтарам вучэбных дапаможнікаў.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ